У цэнтры ўвагі

# Стандарт жыцця грамадства Беларусі — двух-трохдзетная сям'я

**Каля 80 % насельніцтва Беларусі жыве ў сем'ях, а 98 % жыхароў лічаць яе найважнейшай часткай жыцця. Гэта заканамерна, бо шчаслівая сям'я — адзін з прыярытэтаў праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі і аснова развіцця нацыі, упэўненая Марына АРЦЁМЕНКА, начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

У краіне 1 млн 143 тысячы сем'яў з непаўналетнімі дзецьмі, дзе выхоўваецца 1 млн 767 тысяч дзяцей. У 57 % сем'яў — адно дзіця, у 33,5 % — двое, 9,2 % — шматдзетныя. А змены ў структуры ячэек грамадства пазітыўныя. За апошняе дзесяцігоддзе на 43 тысячы вырасла колькасць сем'яў з двума малымі. Цяпер кожная трэцяя сям'я ў краіне — двухдзетная. На столькі ж вырасла і лічба шматдзетных сем'яў, дзе цяпер жыве пятая частка непаўналетніх беларусаў. Можна лічыць, што двух-трохдзетная сям'я стала сацыяльнай нормай, стандартам жыцця грамадства Беларусі, мяркуе спецыяліст:



— Выбудаваная ў краіне сістэма сацыяльнай падтрымкі — па сутнасці, візітная картка Беларусі. Падтрымка гэтая вельмі разнапланавая. Яна датычыцца сферы жыллёвага будаўніцтва, развіцця паслуг па доглядзе дзяцей, сацыяльнага абслугоўвання, гарантыі льгот у сферы адукацыі, аховы здароўя, пенсійнага, працоўнага і падатковага заканадаўства.

Стабільная і роўная падтрымка сем'яў у перыяд нараджэння і выхавання дзяцей да трох гадоў. Дапамога выдаецца на кожнага чацвёртага малога (амаль 450 тысяч дзяцей). Штогод апошнія пяць гадоў расходы на дзяржаўныя дапамогі ў Беларусі складаюць 1,8 % ад ВУП. На наступную пяцігодку мяркуецца накіраваць на гэта каля 16 млрд рублёў. 1 жніўня лічбы дапамог, дарэчы, ізноў падраслі: на першае дзіця да трох гадоў цяпер прадугледжана амаль 500 рублёў, на другое і наступнае — 567, нагадала Марына Арцёменка.

Важная і адрасная сацыяльная дапамога для сем'яў, якія аказаліся ў складаных жыццёвых сітуацыях. Яе асноўная форма — штомесячныя сацыяльныя дапамогі (95 рублёў на аднаго атрымальніка), аднаразовая сацыяльная дапамога (152 рублі) і бясплатнае харчаванне дзяцей першых двух гадоў жыцця (сярэдні кошт набору харчавання — 122 рублі).

— Летась узмацнілася адрасная дапамога шматдзетным, — удакладніла прадстаўніца міністэрства. — Яны цяпер могуць атрымліваць штомесячную сацыяльную дапамогу не шэсць месяцаў, а ўвесь год. Акрамя таго, ім павысілі крытэрый патрэбнасці да 115 % бюджэту пражытковага мінімуму.

Праграмы сацыяльнага абслугоўвання — яшчэ адзін напрамак сацпадтрымкі. Сёння дзейнічаюць 146 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дзе на ўліку больш за 257 тысяч сем'яў.

— У цэнтрах ёсць даволі запатрабаваныя паслугі, у прыватнасці, нянькі. Сёлета такой паслугай скарысталася ўжо амаль 2000 сямей. Права атрымаць няньку з гэтага года маюць усе сем'і, дзе выхоўваюцца інваліды да 18 гадоў, пры ўмове, што такое дзіця даглядае адзін з бацькоў і малы навучаецца дома. Для сем'яў, дзе выхоўваюцца дзеткі з асаблівасцямі, аказваецца паслуга сацыяльнай передышкі (да 56 каляндарных дзён), якая таксама актыўна развіваецца. Пры гэтым права на ўсе сацыяльныя выплаты і дапамогі за сям'ёй захоўваецца. Для сем'яў, якія знаходзяцца ў складанай жыццёвай сітуацыі і маюць патрэбу ў падтрымцы, прадугледжаны сацыяльны патранат. Сёлета гэтым скарысталіся 1586 сем'яў.

**Ірына СІДАРОК.**

Стыхія

# НАВАЛЬНІЧНЫ ФРОНТ НАРАБІЎ БЕД

**Паводле аператыўных даных, з прычыны праходжання навальнічнага фронту з парывамі ветру (большымі за 25 м/с) 17 жніўня пацярпеў 31 населены пункт у Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях, а таксама Мінск, паведамляе МНС.**

У выніку на тэрыторыі Мінскай вобласці адбыліся падзенні дрэў. Ратавальнікі больш за 30 разоў выязджалі на распілоўку дрэў у Вілейскім, Клецкім, Крупскім, Мінскім, Пухавіцкім, Уздзенскім, Маладзечанскім, Капыльскім, Валожынскім, Дзяржынскім раёнах. У Мінскім раёне ў выніку падзення дрэва пацярпеў пенсіянер. Мужчыне аказалі дапамогу мясцовыя жыхары, ён быў дастаўлены ў бальніцу.

У гэты дзень былі пашкоджаны дахі 32 жылых дамоў, 23 сельскагаспадарчыя будынкі ў Вілейскім, Крупскім, Уздзенскім, Маладзечанскім, Капыльскім, Дзяржынскім і Мінскім раёнах.

Стыхія закранула і Віцебшчыну: Чашніцкі, Гарадоцкі, Віцебскі, Бешанковіцкі раёны, а таксама абласны цэнтр. Ратавальнікамі і іншымі службамі праводзіліся аднаўленчыя работы.

Пашкоджаны дахі 22 шматкватэрных і прыватных жылых дамоў, 15 аб'ектаў сельскагаспадарчага прызначэння, аднаго вытворчага памяшкання. Зафіксаваныя 160 выпадкаў падзенняў дрэў, пашкоджаны 21 легкавы аўтамабіль. Для ліквідацыі наступстваў непагадзі прыцягнута 18 адзінак аварыйна-выратавальнай тэхнікі і больш за 60 чалавек асабовага складу падраздзяленняў МНС вобласці.

Па даных «Віцебскэнерга», былі зафіксаваны адключэнні электразабеспячэння ў 511 населеных пунктах вобласці.

У Новалукомлі паваленым дрэвам прыціснула мясцовую жыхарку. Яна была дастаўлена ў бальніцу. Цяпер яе здароўю нічога не пагражае.

У Віцебскім раёне былі часткова пашкоджаны дахі птушнікаў і складскіх будынкаў Віцебскай бройлернай птушкафабрыкі.

У Мінску былі зафіксаваныя інтэнсіўнае выпадзенне ападкаў у выглядзе дажджу (па горадзе выпала месцамі ад 10 да 20 мм) і моцны вецер парывамі да 15 м/с.

У выніку непагадзі адбылося частковае падтапліванне праезных частак і абмежаванне руху грамадскага транспарту (тры аўтобусныя, 18 тралейбусных і пяць трамвайных маршрутаў).

Работнікі МНС выязджалі на аказанне дапамогі па распілоўцы дрэў, якія зваліліся (49 выпадкаў) на праезныя часткі і аўтамабілі (23 транспартныя сродкі пашкоджаны), у адным выпадку — па дэмантажы аварыйных лістоў бляхі з даху жылога дома.



З-за непагадзі адбылося падзенне двух білбордаў на скрыжаванні вуліц Глебкі і Матусевіча і на праспекце Дзяржынскага, а таксама адной дзіцячай пластыкавай гульнявой пляцоўкі на праспекце Пераможцаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота з сайта МНС.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Заява Макрона аб абароне ад афганскіх бежанцаў выклікала хвалю крытыкі ў Францыі

Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон у сваім выступленні, прысвечаным сітуацыі ў Афганістане, заявіў аб намеры абмежаваць паток мігрантаў з гэтай краіны. Выказванні прэзідэнта Францыі неадкладна падвергнуліся крытыцы з сацсетках з боку левых партый, паведамляе французскі тэлеканал BFM TV.



«Мы павінны прадбачыць буйныя нерэгулюемыя патокі мігрантаў, якія могуць падвяргаць небяспецы тых, хто іх прымае, і абараніць сябе ад іх», — сказаў Эмануэль Макрон. Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што дэстабілізацыя ў Афганістане можа прывесці да нерэгулюемых патокаў мігрантаў у Еўропу.

Французскі лідар запэўніў, што Францыя будзе ўдзельнічаць у ініцыятыве, арганізаванай на міжнародным узроўні. «Францыя выконвае і будзе працягваць выконваць свой абавязак па абароне тых, хто падвяргаецца найбольшай пагрозе», — адзначыў Эмануэль Макрон.



Каментарыі прэзідэнта Францыі неадкладна падверглiся крытыцы з боку іншых палітыкаў у сацыяльных сетках. Лідар партыі «Еўропа Экалогія Зялёныя» Жульен Баю ў адказ на словы прэзідэнта напісаў на сваёй старонцы ў Twitter: «А як жа правa на прыстанішча? А як жа гэтыя дзеці, гэтыя жанчыны, гэтыя мужчыны, якія ратуюцца ад жаху? Францыя павінна адыграць сваю ролю, патрэбныя канкрэтныя дзеянні».

Мэр Грэнобля, абаронца навакольнага асяроддзя, які можа стаць кандыдатам на наступных прэзідэнцкіх выбарах, Эрык Пііле таксама выступіў з крытыкай на адрас прэзідэнта: «Ён хоча, каб людзі заставаліся там. Яму ўсё роўна». У загалоўку відэа, размешчанага ў Twitter, мэр абвясціў: «Макрон ганьбіць Францыю!»

Дэпутат Еўрапарламента, французскі палітык і эколаг Янік Жадо таксама адрэагаваў на словы французскага лідара. «Ашаломлены, пачуўшы, як Эмануэль Макрон заяўляе, што жанчыны, мужчыны і дзеці, якія бягуць з пекла «Талібана», у першую чаргу ўяўляюць з сябе пагрозу», — сказаў Янік Жадо.

Пасля вываду асноўнай часткі заходняга вайсковага кантынгенту з Афганістана рух «Талібан» разгарнуў маштабную аперацыю па ўсталяванні кантролю над краінай. Баевікі руху 15 жніўня без бою ўвайшлі ў Кабул і на працягу некалькіх гадзін усталявалі поўны кантроль над афганскай сталіцай.

**«Катастрафічны сыход адміністрацыі прэзідэнта ЗША Байдэна з Афганістана — гэта знешнепалітычнае прыніжэнне, якое краіна не перажывала з часоў іранскага крызісу з заложнікамі» (Майкл Пэн, былы віцэ-прэзідэнт ЗША).**

## Замежнікі масава перасталі наведваць Расію

Па выніках першага паўгоддзя 2021 года, у Расіі пабывала 64,4 тысячы падарожнікаў, што ў 31 раз менш у параўнанні з аналагічным перыядам 2019-га. Пра тое, што замежныя грамадзяне масава перасталі наведваць РФ, паведамляецца на сайце Асацыяцыі тураператараў Расіі.

Пры гэтым лідарам уязнога турпатоку ў першым паўгоддзі гэтага года стала Куба, грамадзяне якой перасякалі граніцу Расіі 20,5 тысячы разоў. На другім месцы — ААЭ. За шэсць месяцаў з турыстычнымі мэтамі ў РФ пабывалі 8,8 тысячы адпачывальнікаў з гэтай краіны. Тройку лідараў замыкае Турцыя, жыхары якой са студзеня да чэрвеня 2021 года ажыццявілі 7,3 тысячы візітаў.

«Турпаток працягвае стрымліваць пандэмія, у першую чаргу тое, што РФ аднесена ў многіх краінах да чырвонай зоны рызыкі: нашу краіну не рэкамендуюць да наведвання, а пасля наведвання турыстам давядзецца прайсці двухтыднёвы каранцін у сябе дома», — расказаў прадстаўнік агенцтва «Інтурыст», звярнуўшы ўвагу, што нават нягледзячы на падобныя складанасці, уязны турызм паступова пачынае аднаўляцца.

# Пасылка з падманам

**Гродзенец прадаў жыхарцы Гомельскай вобласці замест новага касцюма той, што быў у карыстанні**

Жанчына вырашыла абнавіць свой гардэроб, набыўшы новы спартыўны касцюм вядомай маркі «Nike». Аб'яву аб продажы яна знайшла на адной з гандлёвых пляцовак у інтэрнэце. Зацікавіўшыся таварам, звязалася з прадаўцом, жыхаром Гродна. У працэсе перагавораў дамовіліся аб цане. Жанчына аформіла заказ і праз некаторы час у аддзяленні паштовай сувязі забрала пасылку. Касцюм абышоўся ёй у 173 рублі.

Падман выявіўся пасля таго, як была раскрыта пасылка. Зусім не тое меркавала яна ўбачыць. Перад ёй аказаўся спартыўны касцюм, які відавочна быў у карыстанні, прытым зусім іншай гандлёвай маркі. Пакупніца патэлефанавала прадаўцу з патрабаваннем вярнуць грошы, але той адмовіўся. Пасля гэтага жанчына звярнулася з заявай у міліцыю. Для ўстанаўлення кошту тавару была прызначана таваразнаўчая экспертыза. Паводле яе ацэнкі, кошт спартыўнага касцюма з маркіровачнымі знакамі «Adidas», які быў у пасылцы, складае амаль 64 рублі. Згодна з вывадамі эксперта, тавaрам карысталіся, і ён не адносіцца да арыгінальнай прадукцыі вядомай гандлёвай маркі. Па дадзеным факце міліцыя праводзіць праверку.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**